# Юбилеи

# Юбілеі

# Jubilees

## Владимир Константинович КОРШУК

## Уладзімір Канстанцінавіч КОРШУК

## Vladimir Konstantinovich KORSHUK



Заслужанаму работніку адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктару гістарычных навук, прафесару Уладзіміру Канстанцінавічу Коршуку 25 жніўня 2025 г. споўнілася 90 гадоў. Ён атрымаў шырокую вядомасць як даследчык сацыяльна-палітычнай гісторыі Беларусі XX–XXI стст., гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, пытанняў станаўлення і развіцця беларускай партыйнай сістэмы.

Уладзімір Канстанцінавіч нарадзіўся ў г. п. Урэчча Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўніка, кіраўніка Урэчскай сярэдняй школы Канстанціна Фёдаравіча і настаўніцы пачатковых класаў Ганны Давыдаўны. Паспяховая праца бацькі ў педагагічнай сферы стала падставай для пераезду сям'і з немаўлём у Брэст, дзе Канстанцін Фёдаравіч атрымаў пасаду загадчыка Брэсцкага абласнога аддзела народнай асветы. У Брэсце сям'я сустрэла Вялікую Айчынную вайну.

У пачатку 1943 г. Канстанцін Фёдаравіч апынуўся ў партызанскім атрадзе імя М. А. Шчорса. Пазней мужчына забраў да сябе і маленькага сына, бо сям'ю спасцігла вялікае гора: акупанты забілі маці Уладзіміра Канстанцінавіча. Хлопчык да канца вайны знаходзіўся з бацькам у партызанскім атрадзе і вельмі баяўся страціць адзінага роднага чалавека. У. К. Коршук згадваў: «Отец уходил на задание, а меня оставлял у кого-нибудь в деревне… Отца долго, долго не было, я ждал его и думал: "У меня нет мамы, где-то далеко бабушка с дедушкой, что же я буду один, маленький, делать, если привезут отца на санях убитого?" Когда отец вернулся, мне показалось, прошла вечность. А пока я ждал, дал себе слово, что буду называть его теперь только на "вы". Этим мне хотелось подчеркнуть, как я его люблю, как скучаю и то, что он у меня один. Видно, отец вначале не заметил, как я к нему обращаюсь, а потом он меня спросил: "Почему ты говоришь мне "вы"?" Я ему признался, какое дал себе слово и почему. А он мне объяснил: "Ты тоже у меня один, поэтому мы должны говорить друг другу "ты". Мы самые близкие на свете люди". Еще я попросил его, чтобы мы с ним никогда не расставались. "Ты уже взрослый, ты – мужчина", – убеждал он меня». Выхаванне ў такой патрыятычнай

CC BY NC

сям'і з малога ўзросту загартоўвала характар Уладзіміра Канстанцінавіча, фарміравала такія асабістыя якасці, як дабрыня, прыстойнасць, інтэлігентнасць, мэтанакіраванасць, імкненне да пазнання ісціны.

Пасля вызвалення Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў Канстанцін Фёдаравіч працягнуў працу ў сістэме народнай адукацыі на пасадзе загадчыка Мінскага абласнога аддзела народнай асветы. Да ваенных узнагарод (ордэн Чырвонага Сцяга, баявыя медалі) прыбавіліся ўзнагароды за мірную працу (напрыклад, ордэн Леніна – вышэйшая дзяржаўная ўзнагарода ў СССР, ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР»). Аддаючы сябе педагогіцы, не шкадуючы сіл на аднаўленне справы навучання ў разбураных вайной школах, бацька паказаў сыну ўзор захаплення працай, бескарыслівага служэння справе, глыбокага разумення ролі адукацыі ў жыцці чалавека, грамадства, дзяржавы.

Імкненне да пазнання нязведанага і працавітасць дапамаглі У. К. Коршуку скончыць у 1953 г. сярэднюю школу з сярэбраным медалём. Ён прыняў рашэнне паступаць на гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава. Уладзіміру Канстанцінавічу пашанцавала з выкладчыкамі: Б. А. Рыбакоў, Л. В. Чарапнін, С. Д. Сказкін і іншыя вучоныя сфарміравалі светапогляд студэнта-гісторыка. У. К. Коршук актыўна ўдзельнічаў у навуковым, грамадскім і спартыўным жыцці ўніверсітэта. Ужо ў студэнцкія гады ў выданні «Веснік НСО» быў апублікаваны яго першы артыкул, прысвечаны дзейнасці КПБ. Уладзімір Канстанцінавіч меў другі спартыўны разрад па валейболе, з'яўляўся членам зборнай валейбольнай каманды факультэта. Пасля заканчэння ўніверсітэта У. К. Коршук вярнуўся ў Мінск, дзе з 1958 г. ён працаваў настаўнікам гісторыі ў сярэдняй школе № 3, а з 1960 г. – асістэнтам на кафедры гісторыі КПСС Беларускага політэхнічнага інстытута. У хуткім часе Уладзімір Канстанцінавіч быў накіраваны Міністэрствам вышэйшай адукацыі СССР у аспірантуру Маскоўскага энергетычнага інстытута, пасля заканчэння якой у 1963 г. пад кіраўніцтвам прафесара М. І. Мурашова ён паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю «Деятельность Компартии Белоруссии по воспитанию нового человека в коллективах коммунистического труда (1958–1962 гг.)».

Маладым кандыдатам навук У. К. Коршук вярнуўся ў Беларускі політэхнічны інстытут на пасаду старшага выкладчыка. Універсітэцкая культура стала для яго вызначальнай на далейшым навукова-педагагічным шляху. Уладзімір Канстанцінавіч працаваў дацэнтам, намеснікам дэкана агульнатэхнічнага факультэта, а таксама працягваў навуковую работу. Гэта былі першыя прыступкі росту перспектыўнага вучонага, педагога, актыўнага ўдзельніка грамадскага жыцця. У 1971 г. навуковец узначаліў кафедру гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. У гэты ж час па сумяшчальніцтву ён працаваў у Інстытуце павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадазнаўчых навук пры БДУ. На пасадзе загадчыка вучоны зарэкамендаваў сябе як выдатны арганізатар і таленавіты кіраўнік, які праяўляе прафесіяналізм і добразычлівасць у адносінах калег і студэнтаў.

У 1980 г. Уладзімір Канстанцінавіч абараніў доктарскую дысертацыю «Деятельность Компартии Белоруссии по развитию трудовой активности рабочего класса в условиях зрелого социализма». У 1982 г. ён атрымаў званне прафесара. З гэтага часу навуковая і выкладчыцкая праца У. К. Коршука была звязана з БДУ. На працягу многіх гадоў ён узначальваў кафедру гісторыі КПСС, а пасля яе рэарганізацыі – кафедру палітычнай гісторыі. Затым Уладзімір Канстанцінавіч узначаліў кафедру сусветнай і айчыннай гісторыі. З 2001 па 2019 г. У. К. Коршук працаваў прафесарам кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу.

Прафесійная дзейнасць У. К. Коршука паспяхова ажыццяўлялася ў некалькіх кірунках. Ён займаўся састаўленнем першых падручнікаў і навучальных курсаў па гісторыі Беларусі. У 1990-я гг. незалежнай Беларусі была неабходна новая канцэпцыя айчыннай гісторыі, паколькі адбывалася пераасэнсаванне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Гэта тэма стала напрамкам навуковых пошукаў Уладзіміра Канстанцінавіча, ёй прысвечаны больш за 250 публікацый, у тым ліку манаграфіі, артыкулы, вучэбныя выданні, калектыўныя працы. Прафесар стаў суаўтарам кніг «Гісторыя Беларусі» (Мінск, 1998) і «Беларусь на мяжы тысячагоддзяў» (Мінск, 2000). Менавіта У. К. Коршук адным з першых у краіне паставіў пытанне аб неабходнасці вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце ўсеагульнай гісторыі. Па прапанове навукоўца ў чэрвені 1992 г. кафедра, якую ён узначальваў, стала называцца кафедрай сусветнай і айчыннай гісторыі.

Таксама вучоны ўдзяляў увагу распрацоўкам па гісторыі палітычных партый і грамадскіх рухаў. Падмуркам новай галіны гістарычных даследаванняў у Беларусі сталі дзясяткі артыкулаў і выданняў, якія прысвечаны БСГ і іншым палітычным сілам дарэвалюцыйнага часу. Шэраг работ выкананы У. К. Коршукам у суаўтарстве з І. Ф. Раманоўскім, Р. І. Ермашкевічам і С. І. Бусько: «З гісторыі палітычных партый» (Мінск, 1993), «Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах политических партий» (Мінск, 1999), «История политических партий России и Беларуси (конец XIX – первая четверть XX в.)» (Мінск, 2001), «История политических партий. Материалы для самостоятельной работы студентов» (Мінск, 2002), «Политические партии Республики Беларусь» (Мінск, 2005), «История общественных движений и политических партий: вопросы и ответы» (Мінск, 2008), «История политических партий и общественных движений: материалы для самостоятельной работы студентов» (Мінск, 2014).

Значную частку часу прафесар аддаў навукова-метадычнай працы. З 1979 г. ён уваходзіў у склад спецыялізаваных саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. У 1991–1995 гг. Уладзімір

Канстанцінавіч узначальваў савет па абароне кандыдацкіх дысертацый пры БДУ, потым з'яўляўся намеснікам старшыні савета па абароне доктарскіх дысертацый пры гэтым універсітэце. У складаны для беларускай гістарычнай навукі час (1985–1994) ён займаў пасаду адказнага рэдактара часопіса «Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права». На працягу 20 гадоў У. К. Коршук быў членам рэдакцыйных калегій выданняў «Беларускі гістарычны часопіс», «Гуманітарна-эканамічны веснік», выконваў абавязкі рэдактара навуковага зборніка «Працы гістарычнага факультэта БДУ».

З невычэрпнай энергіяй і натхненнем Уладзімір Канстанцінавіч дзеліцца сваім шматгранным навукова-педагагічным вопытам з калегамі-навукоўцамі, выкладчыкамі, студэнтамі. За гады педагагічнай дзейнасці ён падрыхтаваў 1 доктара навук і больш за 30 кандыдатаў навук. Вучні прафесара працуюць выкладчыкамі ва ўніверсітэтах, навуковых цэнтрах і іншых дзяржаўных установах Беларусі, многія з іх займаюць кіруючыя пасады. Яны, як і іх настаўнік, спалучаюць высокі прафесіяналізм з чалавечнасцю, вызначаюцца не толькі здольнасцю даць студэнтам грунтоўныя веды па айчыннай гісторыі, але і здольнасцямі ўлюбіць іх у вучэбную дысцыпліну, сфарміраваць уменні і навыкі, прывіць культуру навукова-даследчай работы.

Актыўная навуковая, педагагічная і грамадская дзейнасць У. К. Коршука не засталася незаўважанай. Ён узнагароджаны ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР «За выдатныя поспехі ў працы». У 2000 г. Уладзімір Канстанцінавіч за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць і значны ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў быў удастоены ганаровага звання «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь». Таксама прафесару прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік БДУ». Акрамя таго, ён выбіраўся ў якасці дэпутата Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Уладзімір Канстанцінавіч – Настаўнік з вялікай літары. Яму ўласцівы высокі прафесіяналізм, працавітасць, аптымізм, дабрыня і прыстойнасць. Жыццёвы шлях навукоўца з'яўляецца яркім прыкладам самаахвярнага служэння гістарычнай навуцы. Педагагічную і навуковую дзейнасць У. К. Коршука працягвае яго дачка Алена, выпускніца Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў, дацэнт кафедры міжнароднай журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ кандыдат філалагічных навук.

Супрацоўнікі гістарычнага факультэта БДУ, калегі, сябры, вучні сардэчна віншуюць Уладзіміра Канстанцінавіча з юбілеем і жадаюць яму творчага даўгалецця, нязгаснай энергіі, моцнага здароўя і дабрабыту!

*А. Г. Каханоўскі*[1]*, Г. І. Маскевіч*[2]*,*
*А. М. Мох*[3]*, А. М. Дулаў*[4]*, С. І. Бусько*[5]

[1]*Александр Геннадьевич Кохановский* – доктор исторических наук, профессор; декан исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандр Генадзевіч Каханоўскі* – доктар гістарычных навук, прафесар; дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aliaksandr G. Kakhanouski*, doctor of science (history), full professor; dean of the faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *kohanovsky@bsu.by*

[2]*Анна Ивановна Маскевич* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Ганна Іванаўна Маскевіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Hanna I. Maskevich*, PhD (history), docent; head of the department of modern and contemporary history of Belarus, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *annamaskevich@gmail.com*

[3]*Елена Николаевна Мох* – кандидат исторических наук, доцент; ведущий научный сотрудник лаборатории историко-обществоведческого и социокультурного образования Академии образования.

*Алена Мікалаўна Мох* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі гісторыка-грамадазнаўчай і сацыякультурнай адукацыі Акадэміі адукацыі.

*Elena N. Mokh*, PhD (history), docent; leading researcher at the laboratory of historical, social and socio-cultural education, Academy of Education.

E-mail: *eln.mokh@gmail.com*

[4]*Анатолий Николаевич Дулов* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой истории и культурного наследия факультета гуманитарного знания и коммуникаций Витебского государственного университета имени П. М. Машерова.

*Анатоль Мікалаевіч Дулаў* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры гісторыі і культурнай спадчыны факультэта гуманітарных ведаў і камунікацый Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

*Anatol M. Dulau*, PhD (history), docent; head of the department of history and cultural heritage, faculty of humanities and communications, Vitebsk State University named after P. M. Masherov.

E-mail: *dulov_78@mail.ru*

[5]*Сергей Иванович Бусько* – кандидат исторических наук; председатель Белорусского общества экскурсоводов и гидов-переводчиков.

*Сяргей Іванавіч Бусько* – кандыдат гістарычных навук; старшыня Беларускага таварыства экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў.

*Siarhei I. Busko*, PhD (history); chairman of the Belarusian Association of Guides and Guide Interpreters.

E-mail: *buskosiarhei@gmail.com*